# Самастойная праца малодшых школьнікаў на ўроках беларускай мовы

*Гарошка Дар'я Аляксандраўна*

УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»

У час навучання выкарыстоўваюцца розныя віды самастойнай працы малодшых школьнікаў, з дапамогай якіх яны самастойна набываюць веды, уменні і навыкі. Усе віды самастойнай працы, якія выкарыстоўваюцца ў вучэбным працэсе, можна класіфікаваць па розных прыметах: па дыдактычнай мэце, па характары вучэбнай дзейнасці школьнікаў, па ўспрыманні, па ступені самастойнасці і элеменце творчасці вучняў.

Усе віды самастойнай працы па дыдактчнай мэце можна падзяліць на пяць груп: 1) набыццё новых ведаў, авалоданне ўменнем самастойна набываць веды; 2) замацаванне і ўдасканаленне ведаў; 3) выпрацоўка ўмення выкарыстоўваць веды ў рашэнні вучэбных і практычных задач; 4) фарміравнне ўменняў і навыкаў практычнага характару; 5) фарміраванне ўменняў творчага характару, умення выкарыстоўваць веды ў новай сітуацыі.

Кожная з пералічаных груп уключае ў сябе некалькі відаў самастойнай працы, паколькі рашэнне адной і той жа дыдактычнай задачы можа ажыццяўляцца рознымі спосабамі. Вызначаныя намі групы цесна звязаны паміж сабой. Напрыклад, з дапамогай эксперыментальных, практычных прац дасягаецца не толькі набыццё ўменняў і навыкаў, але таксама і набыццё ведаў і выпрацоўка ўмення выкарыстоўваць раней атрыманыя веды.'

Вучням трэба даваць такія самастойныя работы, якія маюць непасрэдную сувязь з жыццём, з моўнай практыкай дзяцей. Каб самастойная праца давала выдатныя вынікі, дапамагала школьнікам засвоіць веды і набыць уменні, спрыяла развіццю іх здольнасцяў, настаўнік павінен помніць:

− кожны новы від самастойнай працы малодшыя школьнікі спачатку асвойваюць пры непасрэдным удзеле настаўніка, які іх навучае адпаведным прыёмам дзеянняў;

− праца, якая не патрабуе разумовай дзейнасці ад школьнікаў, не разлічаная на праяву імі кемліваці, не будзе самастойнай;

− заданні павінны давацца так, какб вучні ўспрымалі іх як сваю ўласную пазнавальную ці практычную мэту і актыўна імкнуліся да лепшых поспехаў;

– калі ў класе ёсць вучні, для якіх заданне непасільнае, то гэтым вучням настаўнік дае індывідуальныя заданні.

Кожнаму вучню неабходна ўмець самастойна набываць веды, авалодваць уменнямі, выкарыстоўваць іх у жыцці. Таму мэтазгодна далей разгледзіць асноўныя патрабаванні да самастойнай працы: вучыць школьнікаў на ўроках беларускай мовы правільным, рацыянальным прыёмам самастойнай працы; сачыць, каб у дзяцей не было перагрузкі, выкліканай гэтымі заданнямі; выкарыстоўваць час на ўроках з максімальнай прадуктыўнасцю.

Для таго, каб навучыць школьнікаў працаваць самастойна, неабходна рэгулярна, падчас сумеснай працы настаўніка з усімі дзецьмі навучаць іх прыёмам самастойнай працы, самакантролю і самаацэнцы. Неабходна выкарыстоўваць арганізацыйныя формы калектыўнай (парнай) самастойнай працы, уключаць гэтыя формы ў працэс тлумачэння і замацавання. Каб самастойная навучальная дзейнасць працякала паспяхова, неабходна абавязкова правяраць у кожнага вучня ўсе самастойныя працы.

Пры праверцы пісьмовых самастойных прац узаемакантроль ажыццяўляецца ў статычнай пары. Галоўнай умовай з’яўляюцца сяброўскія адносіны. Пры выкананні вусных самастойных прац варта выкарыстоўваць калектыўнае навучанне, працу ў розных парах – статычных, дынамічных, варыянтных. Неабходна стварыць умовы і матывацыю для актыўнай працы кожнага вучня з улікам яго індывідуальных асаблівасцяў.

Самастойная праца аказвае значны ўплыў на глыбіню і трываласць ведаў школьнікаў, на развіццё іх пазнавальных здольнасцяў, на тэмп засваення новага матэрыялу. Самастойная праца заўсёды мае вызначаную дыдактычную скіраванасць. На ўроку яна служыць наступным галоўным дыдактычным мэтам: вывучэнню новага матэрыялу, удасканаленню набытых ведаў і ўменняў, праверцы вынікаў навучання. Арганізуючы самастойную працу, настаўнік ставіць розныя мэты: навучанне, развіццё, выхаванне дзяцей. Таму адрозніваюць самастойныя працы трох тыпаў: рэпрадуктыўныя, часткова-пошукавыя, даследчыя. Заданні для самастойных прац першага тыпу заключаюць у сабе патрабаванне выканаць тыя ці іншыя дзеянні па ўзоры. Выконваючы такія заданні, вучні перабудоўваюць і сістэматызуюць набытыя веды. Самастойная праца ў гэтых выпадках спрыяе лепшаму асэнсаванню новага і замацаванню ў памяці вывучанага матэрыялу. Самастойныя працы часткова-пошукавага характару даюць школьнікам магчымасць самім знайсці шлях і спосаб рашэння вызначанай задачы. Даследчыя самастойныя працы – адзін з метадаў праблемнага навучання. Такія працы ўяўляюць сабой невялікія

вучнёўскія даследаванні, у выніку якіх малодшыя школьнікі набываюць новыя веды ці пазнаюць новы спосаб дзеяння. Як вядома, даследванне пачынаецца з пытання. Пытанне выклікае цяжкасць. З'яўляецца мэта дзейнасці, вызначаецца план, у якім прадугледжваюцца некаторыя варыянты іх рашэння. Выбіраецца пасля аналізу аптымальны варыянт дзеяння, ён ажыццяўляецца і затым робіцца вывад. Пры выкананні такога тыпу прац выяўляецца творчасць школьнікаў.

Такім чынам, пры арганізацыі самастойнай працы галоўнае заключаецца ў тым, каб прапаноўваць практыкаванні ў сістэме, якая забяспечвае паступовае павышэнне ступені самастойнасці вычняў.